**ДАСЛЕДЧЫ МЕТАД** – спосаб арганізацыі пошукавай дзейнасці вучняў шляхам пастаноўкі перад імі задач, якія патрабуюць самастойнага творчага вырашэння.

Мэта даследчага метада на ўроку літаратуры – падрыхтаваць вучняў да самастойнага вывучэння літаратурных твораў, сфарміраваць уменні ацэньваць іх ідэйныя і мастацкія вартасці, выпрацоўваць крытэрыі іх ацэнкі, удасканальваць мастацкі густ.

Паколькі гэты метад патрабуе ад вучняў даваолі высокай ступені самастойнасці, яго мэтазгодна выкарыстоўваць у старшых класах. Але пачынаць фарміраванне ў вучняў уменняў здабываць веды самастойна неабходна з малодшых класаў.

Даследчы метад надзвычай блізкі да эўрыстычнага. Розніца паміж імі заключаецца ў навучальнай ролі настаўніка і вучэбнай дзейнасці вучняў.

Даследчы метад рэалізуецца праз наступныя прыёмы: пастаноўка настаўнікам перад класам праблемы, асноўныя аспекты якой вырашаюцца групаю вучняў або па індывідуальным заданні; распрацоўка і прапанова вучням тэм і пытанняў да семінарскіх заняткаў, пастаноўка перад класам задачы падрыхтаваць паведамленне на адну з прапанаваных тэм або самастойна прааналізаваць пазапраграмны твор.

Віды дзейнасці вучняў пры даследчым метадзе: самастойны аналіз усяго твора або яго часткі; супастаўленне двух або некалькіх праграмных твораў; супастаўленне розных поглядаў у літаратурнай крытыцы; супастаўленне твора з яго інтэрпрэтацыяй у тэатры або ў кіно і інш.

Вынікі такой працы могуць быць афармлены ў выглядзе вучнёўскіх дакладаў або сачыненняў.

Даследчы метад актывізуе цікавасць вучняў да творчага пошуку і забяспечвае авалоданне імі метадаў навуковага пазнання, рыхтуе школьнікаў да навукова-даследчай працы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ